Беларускі універсітэт ад 21 студзеня 1957 года

Гэта старонка прысвячаецца самаму шматлікаму атраду нашага друку—насценным газетам. Друкуючы рад матэрыялаў аб рабоце насценных газет універсітэта, мы спадзяёмся, што яны будуць карыснымі для многіх работнікаў нізавога друку.

# СОТЫ, ЮБІЛЕЙНЫ

Нядаўна выйшаў соты нумар насценгазеты «За мичуринскую биологию». Юбілей газеты якраз супаў са слаўнай гадавінай—40-годдзем Беларусі. І ад гэтага нам, членам рэдкалегіі, радасна ўдвая.

Сто нумароў за дзесяць год! У кожным вучэбным годзе—дзесяць выпускаў.

У цяперашнім складзе рэдкалегіі 20 чалавек. Кожны выпуск абмяркоўваецца на пасяджэннях рэдкалегіі. Тут даюцца даручэнні, выказваюцца розныя заўвагі і прапановы. Матэрыялы апрацоўваюцца ў асноўным членамі рэдкалегіі.

Рэдкалегія стараецца адлюстроўваць усё жыццё факультэта. Амаль з нумару ў нумар ідуць рубрыкі «На кафедрах, у лабараторыях і навукова-даследчых гуртках», «На тэму дня», «Аб сябрах, таварышах», «З рэдакцыі» і іншыя. У кожным аддзеле ёсць адказны. Наша газета падымала шэраг важных пытанняў, такіх, як «Памяць аб чалавеку—дрэўца» (аб пасадцы дрэў у Чырвоным Урочышчы), «Лекцыі і канспекты» (аб неабходнасці друкаваць лекцыі вядучых выкладчыкаў), «Супраць фармалізму і аднабаковасці» (аб перанясенні выхаваўчай работы на кафедры). У двух нумарах абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з перабудовай вышэйшай адукацыі. З шостага нумару ўведзена сталая рубрыка «Па слядах нашых выступленняў».

Вядома, пры ўсіх іншых вартасцях газеты, асноўнае—яе дзейснасць. А гэтага дабіваюцца людзі, калектыў, які мае дачыненне да выпуску. Наша рэдкалегія папаўняецца новымі членамі круглы год. Праўда, над выпускам кожнага нумару працуюць 5—6 чалавек, астатнія—студкоры, студэнцкі актыў.

Трэці год працуе ў газеце студэнтка чацвёртага курса Тамара Міхеева. І матэматыку, і філолагу цікава прачытаць яе лірычную замалёўку «Ля Палярнага круга», а таксама «Добрае далёка чуваць» аб гурткоўцах-генетыках.

Шмат своеасаблівага, чыста студэнцкага нясе ў газету выпускнік Валянцін Міхалковіч. Для яго няма нецікавых, непасільных заданняў.

Члена рэдкалегіі Надзю Батурыцкую выбралі старшынёю профбюро факультэта. Але газету яна не пакінула і ніякіх скідак на сваю занятасць не просіць. Другія прышлі ў газету інакш. Славе Сіцько, напрыклад, хацелася папасці на нейкі вечар. «Напішы заметку—білет будзе!»—сказаў хтосьці з членаў рэдкалегіі. Слава, ціхі і сціплы юнак, сеў і напісаў цудоўную заметку—аб сваім гуртку сістэматыкі раслін: «Прыходзьце да нас—у нас цікава!» А Аляксандр Астапеня сваёй газеты не чытаў, і нехта прапанаваў увесці яго ў рэдкалегію. Зараз ён актыўны студкор і выдатны фатограф.

З такімі людзьмі добра і цікава працаваць, усёроўна, ці яны ў рэдкалегіі чацвёрты год, як Іна Кабайлава, Іра Варабейчыкава, ці першы, як Ала Лабковіч, Тамара Лебедзева. Шмат дапамагае газеце кандыдат біялагічных навук камуніст Л. М. Сушчэня.

**М. ГЕСЬ,**
адказны рэдактар газеты біялагічнага факультэта «За мичуринскую биологию».